# Музыканты збіраюць лаўры

## Калектывы Беларускага саюза музычных дзеячаў на міжнароднай арбіце

Наталля ВАСІЛЁНАК

**Рыхтуючыся да 25-годдзя БСМД, яго члены і творчыя калектывы папаўняюць скарбонку сваіх дасягненняў. З сапраўдным фурорам у Санкт-Пецярбургу на міжнародным конкурсе-фестывалі фальклорнай творчасці "Малахитовая шкатулка" выступілі прадстаўнікі нашага саюза.**
**Гэты прэстыжны конкурс-фестываль, які мае глыбокія народныя карані, праводзіцца з мэтай папулярызацыі традыцыйных формаў самадзейнай творчасці, павышэння прафесійнага майстэрства выканальніцкіх калектываў, далучэння шырокай грамады да мастацкай творчасці, выхавання музычнага густу на прыкладзе культурных традыцый розных народаў.**



*Ансамбль трубачоў "Festivo".*

Сёлетні творчы форум "Малахитовая шкатулка" ярка прадэманстраваў умацаванне сяброўскіх сувязей паміж народамі, гарманізацыю міжэтнічных і міжнацыянальных зносін, стаў прыкладам узаемаўзбагачэння нацыянальных культур. Вельмі цёпла прынялі выступленне калектыву БСДМ — ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў "Дудачка" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у складзе Андрэя Сцяпанава, Андрэя Анціпенкі, Дзмітрыя Сопава, Марыі Драмковай і Яніны Якшэвіч (мастацкі кіраўнік — дацэнт Ігар Мангушаў). І як вынік — высокая ацэнка майстэрства гэтага калектыву міжнародным журы: званне лаўрэата конкурсу з уручэннем дыплома І ступені. Дарэчы, двое ўдзельнікаў гэтага ансамбля на высокім узроўні прадэманстравалі і магчымасці нашых нацыянальных інструментаў — дудкі, жалейкі, дуды, акарыны, — упэўнена выступіўшы ў сольнай намінацыі: Марыя Драмкова заваявала званне лаўрэата конкурсу з уручэннем дыплома І ступені, а Андрэй Сцяпанаў за сваё віртуознае выкананне быў адзначаны Гран-пры конкурсу. (Выкладчык маладых музыкантаў — дацэнт Ігар Мангушаў, канцэртмайстар — Настасся Юшкова).

Поспехаў дамогся на гэтым жа конкурсе яшчэ адзін калектыў БСМД — ансамбль трубачоў "Festivo" (мастацкі кіраўнік — прафесар Аляксандр Карацееў). Гэтыя выканаўцы на беларускіх народных драўляных трубах — Сяргей Каванаў, Аляксандр Карацееў, Андрэй Анціпенка, Дзяніс Смірноў — здзівілі публіку і калег тым, што на такіх быццам бы архаічных традыцыйных інструментах, на якіх гучалі толькі сігналы пастухоў, была выканана арыгінальная праграма з твораў І. Мангушава: "Рана, рана сонейка ўзышло", "Урачыстая фанфара", полька "Скакуха". І як пацвярджэнне майстэрства нашых музыкаў — званне лаўрэата конкурсу з уручэннем калектыву дыплома І ступені.



*Марыя Драмкова, Ігар Мангушаў і Андрэй Сцяпанаў.*

Нядаўна прадстаўнікі БСМД вярнуліся з прэстыжнага музычнага форуму — IV міжнароднага фестывалю духавой музыкі імя Васіля Саколіка "Фанфары Ялты". Прадстаўляючы Беларусь, нашы выканаўцы годна выступалі падчас правядзення марш-параду, цырымоніі адкрыцця, у канцэртных праграмах, шыкоўным капусніку "Музыкі ўсміхаюцца", у конкурсных праграмах, цырымоніі закрыцця і заключным гала-канцэрце. І вынікі ўражваюць! Ансамбль трубачоў "Festivo" заваяваў званне лаўрэата і дыпломы II ступені нават у дзвюх намінацыях: класічнае выканальніцтва і эстрадна-джазавае выканальніцтва.

А вось народны духавы аркестр "Віціны" раённага Цэнтра культуры са Стоўбцаў (мастацкі кіраўнік калектыву — Аляксандр Нічыпаровіч) прывёз з Ялты званне лаўрэата конкурсу ў намінацыі "Аматарскія калектывы" і прэстыжны Гран-пры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ